10. Skarbiec dyplomatów papieskich, cesarskich, królewskich, książęcych, uchwał narodowych, postanowień różnych władz i urzędów, posługujących do krytycznego wyjaśnienia dziejów Litwy, Rusi litewskiej i ościennych im krajów: w 2 t. // ukl. Ignacy Daniłowicz. – Wilno: Druk. A. H. Kirkora i sp, 1860. – T. 1. – 391 s.
11. *Halecki, O.* Dzieje Unii Jagiellońskiej / O. Halecki. – Kraków: Akademia Umiejętności, 1919. – T. 1.: W wiekach średnich. – 482 s.
12. *Kolankowski, L.* Dzieje Wielkiego Ksienstwa Litewskiego za Jagiellonow / L. Kolankowski. – T.1: 1377–1499. – Warszawa: Kasa im. Mianowskiego, 1930. – 474 c.

**(Дата подачи: 24.02.2023 г.)**

*А. Р. Раюк*
Незалежны навуковец, Мінск

*A. R. Rayuk*
Independent scientist, Minsk

**УДК 94(476) «1863/1915»**

# УРБАН КРУПСКІ (1863–1915): АД БЕЛАРУСКАГА НАРОДНІКА ДА КРАЁЎЦА-КАНСЕРВАТАРА

# URBAN KRUPSKY (1863–1915): FROM A BELARUSIAN NARODNIK TO A CONSERVATIVE KRAJOVETS

*У артыкуле выяўляецца, як праз Урбана Крупскага многія ідэі народнікаў-«гоманаўцаў» значна паўплывалі на погляды і праграмы краёўцаў-кансерватараў Беларусі ў пачатку XX ст.*
*Ключавыя словы: народніцкая група «Гоман»; Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі; беларускі палітычны кансерватызм; краёўцы; Урбан Баніфацевіч Крупскі; Эдвард Адамавіч Вайніловіч.*

*The article reveals how via Urban Krupsky many ideas of the "Homon"'s narodniks significantly influenced the views and programs of the Krajowcy conservatives of Belarus in the early XX$^{th}$ century.*
*Key words: "Homon"'s narodniks; Minsk agricultural society; Belarusian political conservatism; the Krajowcy; Urban Krupsky; Edward Voinilovich.*

У сваёй кнізе «Гісторыя Беларусі» (1925) Мітрафан Доўнар-Запольскі ў раздзеле «Зародкі нацыянальнага адраджэння» адзначыў: «У Пецярбургу гуртком студэнтаў выдаецца нелегальная газета “Гомон”. Гэта быў першы прадвеснік» [1, с. 449]. Беларускі гісторык Алена Сакольчык ідэі народнікаў-«гоманаўцаў» абагульніла наступным чынам: а) прызнанне беларускага этнасу як «асобнай галіны славянскага племені» з адпаведным вылучэннем двухбаковага пратэсту і супраць русіфікацыі, і супраць паланізацыі; б) абавязковы ўздым «маральнага, разумовага і эканамічнага ўзроўню народа», даць народу магчымасць праявіць свой «нацыянальны геній <…> свабодна развіваць сваю культуру і распараджацца ў сваім унутраным жыцці»;

в) наданне права беларусам «на аўтаномную федэратыўную самастойнасць у сям'і іншых народнасцей Расіі», змагаючыся разам з партыяй «Народная воля» супраць царскага самадзяржаўя [2, с. 338–339]. А гістарычнае значэнне «Гомона», паводле А. Сакольчык, заключаецца «ў сфармуляванні і тэарэтычным доказе існавання самастойнага беларускага народа, што ў многім каталізавала розныя формы мясцовай грамадскай ініцыятывы» [2, с. 339].

Алег Латышонак указаў, што ў тэкстах беларускіх народнікаў назіраюцца два розныя падыходы: арганічная праца на карысць уласнага беларускага народу (публіцыстыка «Данілы Баравіка») і інтэрнацыянальная рэвалюцыя (публіцыстыка «Шчырага Беларуса», які на самой справе выказваў погляды не беларускіх народнікаў, а рускага кіраўніцтва «Народнай волі», якое не хацела дзяліць партыю на асобныя нацыянальныя арганізацыі) [3, с. 116].

Сцяпан Александровіч вызначыў, што кіраўнікамі студэнцкай народніцкай групы «Гомон» былі Аляксандр Марчанка і Хаім Ратнер, а ў асноўны склад групы (ядро) уваходзілі таксама Урбан Крупскі, Марцін Стацкевіч і Станіслаў Нясцюшка-Буйніцкі, з якім былі звязаны менш уплывовыя члены – Лявонцій Насовіч, Баляслаў Рынкевіч, Марцэлій Янчэўскі, Л. Гарадзішча, Арцём Высоцкі, Аляксандра Ратнер (сястра Хаіма) і інш. [4, с. 10].

Андрэй Унучак пра ўплыў ідэй беларускага народніцкага часопіса «Гомон» на беларускіх сацыялістаў пачатку XX ст. адзначыў: «Мы не бачым механізму трансляцыі тэксту – проста не выяўлена. Часопіс не цытуецца ў "Нашай ніве". Але самае істотнае, што ва ўспамінах, перапісцы таго перыяду згадкі пра "Гомон" мы не сустракаем аж да Першай сусветнай вайны» [5, с. 43]. Ігар Марзалюк дадаў: «Пра існаванне "Гомона" ў Мінску ведалі. І Адам Багдановіч ведаў пра яго са слоў мінскіх і віцебскіх народнікаў. Іншая справа, ці чытаў ён яго сам, бо лічыў, што "Гомон" быў беларускамоўным выданнем» [5, с. 43]. А. Унучак ацаніў, што пецярбургскі «Гомон» не зрабіў вялікага ўражання на народнікаў у Мінску (як пацвярджаецца сведчаннем А. Багдановіча, аднаго з кіраўнікоў мінскай арганізацыі «Народнай волі») і ўплыву на інтэлігенцыю «нашаніўскага» перыяду [2, с. 488].

Польскі гісторык Рышард Радзік прывёў інфармацыю ад дзеяча сацыялістычнага руху Вітальда Наркевіча-Ёдкі (1864–1924), які нарадзіўся ў Слуцку, скончыў слуцкую гімназію і ў 1903 г. надрукаваў у лонданскім часопісе «Przedświt» нататку пад назвай «З прычыны беларускай адозвы», дзе ўказвалася: «Маем перасцярогу, каб намаганні групы БРП (Беларускай рэвалюцыйнай партыі. – *А. Р.*) не напаткаў лёс яе папярэднікаў – рэдактараў «Гомона». Пад такой назвай у 1882 г. выдаваўся гектаграфічны часопіс на рускай мове, які паставіў перад сабой мэту стварыць беларускую інтэлігенцыю і культуру. Яго рэдактарамі былі маладыя палякі, якія знаходзіліся ў навучальных установах Пецярбурга і падчас вучобы пачулі ў сябе прыналежнасць да беларускага народа. Рэчаіснасць, якая не давала ніякага пад-

мацавання іх памкненням, і адсутнасць рэальнай рэвалюцыйнай праграмы вельмі хутка зрабілі з іх звычайных літоўскіх філістараў, акрамя маленькай групы, якая абмаскалілася» [6, с. 56–57]. І Р. Радзік дапусціў тое, што В. Наркевіч-Ёдка разумеў слова «палякі» максімальна шырока і што ў рэдагаванні падпольных часопісаў прымалі ўдзел у тым ліку асобы «рускага роду, польскай нацыі», асабліва калі ўлічыць сацыяльны склад тагачаснага студэнцкага асяроддзя [7, с. 302]. Аднак Р. Радзік усё ж заключыў, што народнікі-гоманаўцы «не пакінулі пасля сябе ні непасрэдных прадаўжальнікаў, ні выразных слядоў у свядомасці стваральнікаў беларускасці дарэвалюцыйнага перыяду XX ст.» [7, с. 306].

У дадзеным артыкуле мы ставім за мэту выявіць, ці мела дзейнасць народніцкай групы «Гомон» непасрэдных прадаўжальнікаў і якія ўплывы на погляды беларускіх палітычных дзеячоў канца XIX – пачатку XX ст. яна зрабіла. Для гэтага нам спатрэбілася адшукаць факты біяграфіі аднаго з удзельнікаў народніцкай групы «Гомон» – Урбана Баніфацевіча Крупскага (1863–1915). Ён нарадзіўся 15 ліпеня 1863 г. у фамільным маёнтку Навасёлкі Ігуменскага павета ў сям'і сярэднезаможнага беларускага дваранінакаталіка Баніфацыя Урбанавіча Крупскага (1822–1903) і яго жонкі Стэфаніі Фларыянаўны Свіды (1841–1896) і быў хрышчаны ў каталіцтва [8].

Баніфацый Крупскі скончыў слуцкую гімназію і прыродазнаўчы факультэт санкт-пецярбургскага ўніверсітэта, а пасля рэалізоўваў сялянскую рэформу (1861), быў выбраны на пасаду міравога пасрэдніка Ігуменскага павета, заслужыўшы прызнанне і павагу жыхароў сваёй акругі, і заснаваў у Навасёлках народную школу. Ён не быў прыхільнікам узброенай барацьбы супраць расійскай улады, але ўсё ж удзельнічаў у Студзеньскім паўстанні (1863–1864), заняўшы пасаду паўстанчага камісара Ігуменскага павета. Хутка быў арыштаваны, прысуджаны да пазбаўлення правоў стану, канфіскацыі маёнтка Навасёлкі і высылкі на катаргу на 8 гадоў. У Сібір у 1864 г. па сваёй волі з Баніфацыем Крупскім адправілася яго жонка Стэфанія, пакінуўшы дома двух малых дзяцей (у тым ліку Урбана). Ва Усоле ў сям'і Крупскіх нарадзіліся яшчэ дзве дачкі. У жніўні 1874 г. Баніфацый Крупскі атрымаў дазвол вярнуцца на радзіму; спачатку паехаў у Варшаву, а пазней вярнуўся ў Мінскую губерню, у 1876–1880 гг. жыў у маёнтку Мяцявічы Слуцкага павета, які належаў яго сёстрам, у 1883 г. стаў членам Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі (МТСГ).

Урбан Крупскі нарадзіўся ў час, калі бацька быў вязнены ў Мінску, таму маці Стэфанія прынесла немаўля прама ў вязніцу, каб бацька змог пабачыць сына [8]. Апеку над дзецьмі Крупскіх узяла сястра Баніфацыя – Леакадзія Урбанаўна Арачэўская, у якой у маёнтку Васільчыцы ў Слуцкім павеце Урбан Крупскі правёў свае першыя 10 гадоў жыцця [8]. Бацькі добра пазналі Урбана Крупскага толькі пасля пераезду ў Мяцявічы. Гімназію Урбан Крупскі скончыў у Слуцку, а ў 1878 г. паступіў у санкт-пецярбургскі ўніверсітэт на фізіка-матэматычны факультэт [8].

Ва ўніверсітэце ён уключыўся ў беларускую студэнцкую групу, якая спачатку называлася «Беларуская грамада» (1881), а пазней «Сацыяльна-рэвалюцыйная беларуская народная партыя» (1882), «Беларуская арганізацыя» (1883–1884) і «Гоман» (1884), якая выдавала газету «Гомон». Сходы групы ў Пецярбургу адбываліся ў тым ліку на кватэры Марціна Стацкевіча і Урбана Крупскага [4, с. 11]. У ліку іншых членаў групы Урбан Крупскі быў затрыманы, дапрошаны расійскімі ўладамі і папаў пад следства; універсітэт скончыў толькі ў 1887 г. [4, с. 11; 8].

У 1889 г. жонкай Урбана Крупскага стала дваранка Гелена Свіда, якая памерла ў 1901 г., але паспела нарадзіць чатырох сыноў – Чэслава (1889–1940), Конрада, Януша (1898–1939) і Стэфана. Пасля шлюбу Урбан Крупскі асеў і гаспадараваў у сваім маёнтку Засулле Мінскага павета (каля Стоўбцаў), у тым жа 1889 г. стаў членам МТСГ – і з таго часу, пазбягаючы ідэй сацыяльнага радыкалізму, энергічна ўключыўся ў дзейнасць многіх афіліятыўных арганізацый МТСГ. Так, з 1889 г. быў адным з дырэктараў Мінскага таварыства вінакурнікаў [9, с. 192].

У МТСГ, у якім пачалі згрупоўвацца мясцовыя заможныя і ўплывовыя ліберальна-кансерватыўныя маянткоўцы, Урбан Крупскі сышоўся з яго кіраўніком – Эдвардам Вайніловічам (выпускніком слуцкай гімназіі), а таксама іншымі аўтарытэтнымі дваранамі-землеўласнікамі як Мінскай губерні, так і суседніх. У 1899 г. Урбан Крупскі быў выбраны ў члены Рады МТСГ, дзе засядаў побач з Эдвардам Вайніловічам, князем Геранімам Друцкім-Любецкім, графам Каралем Чапскім, графам Ежы Чапскім, Яўстахам Любанскім, Раманам Скірмунтам, МіхаламВаловічам і інш., бо пастаянна перавыбіраўся на гэтую пасаду да самай сваёй смерці ў 1915 г. Аб хутка атрыманым уплыве і аўтарытэце сярод карэнных маянтковых дваран Мінскай губерні сведчыла тое, што Урбан Крупскі на пасяджэнні МТСГ 10 снежня 1899 г. у Мінску быў выбраны ў члены распарадчага камітэта па ўладкаванні Юбілейнай сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай выстаўкі МТСГ у Мінску, якая адбылася ў 1901 г. [10, с. 5]. У 1900 г. Урбан Крупскі разам з Аляксандрам Любанскім, Эдмундам Барткевічам, Марыянам Хелхоўскім і Эмануэлем Абрампальскім увайшоў у рэвізійную камісію новастворанага Мінскага таварыства ўзаемнага сельскагаспадарчага страхавання (ад агню) [9, с. 237]. З 1901 г. часта жыў у Мінску: у 1910–1911 гг. у доме Ленскага (завулак Захар’еўскі), а ў 1913 г. у доме Поляка (на вуглу Петрапаўлаўскай і Захар’еўскай вуліц).

У 1902–1903 гг. многія члены МТСГ (у тым ліку яго лідар Эдвард Вайніловіч) прынялі актыўны ўдзел у працы Мінскага губернскага камітэта Асобнай нарады аб патрэбах сельскагаспадарчай прамысловасці, дзе імі была разгорнута дыскусія як пра гаспадарчае, так і культурнае і палітычнае становішча беларуска-літоўскіх губерняў у Расійскай імперыі. У мінскі павятовы камітэт Нарады былі выбраны такія члены МТСГ, як браты граф Караль Чапскі і граф Ежы Чапскі, князь Геранім Друцкі-Любецкі, Міхал

Ленскі, Вільгельм Ельскі, Урбан Крупскі, Рамуальд Хелхоўскі, Францішак Лянтоўскі, Альгерд Svіда. 20 ліпеня 1902 г. на пасяджэнні мінскага павятовага камітэта Урбан Крупскі выказаў прапанову, што паколькі большасць пытанняў праграмы Асобнай нарады датычацца сялянскіх гаспадарак, то на пасяджэнні камітэта неабходна запрасіць сялян або ўпаўнаважаных ад сельскіх таварystваў, якія б і патлумачылі камітэту аб сваіх патрэбах. Крупскі заўважыў, што паколькі селянін у цяперашні час знаходзіцца адасобленым ад астатняга насельніцтва, і таму пазбаўлены магчымасці ў пастаянных зносінах з больш развітымі людзьмі пашырыць свой разумовы кругагляд і атрымаць палепшанае выхаванне, то хай бы гэтае запрашэнне сялян было першым пачынаннем да знішчэння гэтай адасобленасці [11, с. 177]. Гэтым Крупскі арыентаваў дваран-землеўласнікаў на кансалідацыю з простым беларускім сялянствам.

У 1903 г. у Дынабургу сельскагаспадарчая выстаўка, арганізаваная Віцебскім таварystвам сельскай гаспадаркі, па сутнасці ператварылася ў значны з’езд беларуска-літоўскіх дваран-землеўласнікаў. На выстаўцы выступіў лідар МТСГ Эдвард Вайніловіч і адкрыта заявіў сябе беларусам па нацыянальнасці, што было заўважана прысутнымі [12, с. 72]. Яўгеніуш Ромер, які чуў прамову Вайніловіча ў Дынабургу, у сваім дзённіку адзначыў, што тое самае было і ў 1901 г. падчас выстаўкі ў Мінску [12, с. 72]. Вайніловіч у Дынабургу ў аптымістычнай прамове па-польску заклікаў маянткоўцаў трымацца за зямлю і дадаў у канцы беларускамоўнае выслоўе «Pomahaj Bože!», сказаўшы, што многія народы прайшлі праз Беларусь, «але нязменным застаўся той карэнны беларускі народ, які ў хвілінах бяды прыпадаў да роднай зямлі і ў ёй чэрпаў суцяшэнне і сілу <…> і кончу, звяртаючыся да вас, землеўласнікі, нашым родным [выслоўем] “Памагай Божа!”» [13, с. 18].

Памятныя кніжкі Мінскай губерні і календары газеты «Kurjer Litewski» зафіксавалі вельмі актыўны і шырокі ўдзел Урбана Крупскага ў адміністрацыйных, гаспадарчых і культурных арганізацыях Мінскай губерні. Так, у 1906 г. ён быў кандыдатам (намеснікам) земскага гласнага ад Мінскага павета ў Мінскім губернскім камітэце па справах земскай гаспадаркі, а ў 1912–1914 гг. – гласным у мінскім павятовым земскім сходзе. З 1908 г. быў членам, а ў 1913–1914 гг. ужо значыўся сярод старшынь Мінскага грамадскага сходу (разам з Ігнатам Віткевічам, скарбнікам МТСГ, Міхалам Валовічам, Эмануэлем Абрампальскім і інш.). У 1908 г. па ініцыятыве слуцкага аддзела МТСГ, дзе з 1905 г. віцэ-старшынёй быў брат Урбана Крупскага – Станіслаў, у МТСГ была створана камісія (Урбан Крупскі, Францішак Лянтоўскі, С. Трускаласкі, К. Загорскі, Уладзіслаў Лопат, Канстанцін Дзямідэцкі-Дзямідовіч, граф Уладзіслаў Замойскі) для стварэння ў Слуцкім павеце дапаможна-пазыковай касы для афіцыялістаў і сельскіх работнікаў [9, с. 214]. У 1910 г. Урбан Крупскі і Міхал Ястржэбскі ўпаміналіся як віцэ-старшыні (пры старшыні Яўстаху Любанскім) мінскага аддзела Усерасійскага саюза вінакурнікаў. У 1907 г. у Мінску было створа-

на таварыства «Ognisko» (на чале з Яўстахам Любанскім), дзе скарбнікам стаў Урбан Крупскі, а ў 1909 г. апошні ўпамінаўся як член рады «Ognisko», у 1910 г. – як член наглядной рады Польскага таварыства «Асвета» ў Мінску, а ў 1912 г. як член гімнастычнага таварыства «Sokół».

У маі 1907 г. адбыліся выбары віцэ-старшыні МТСГ (каб быць намеснікам старшыні – Эдварда Вайніловіча), на якіх Урбан Крупскі (ад 70 галасуючых асоб) атрымаў 33 галасы, а Раман Скірмунт – 32 [14]. Вайніловіч прапанаваў Крупскаму прыступаць да абавязкаў, аднак пазней усё ж палічылі, што выраз «простая большасць» у статуце МТСГ трэба разумець як «абсалютная большасць» [15]. У кастрычніку 1907 г. адбыліся паўторныя выбары, калі віцэ-старшынёй МТСГ стаў Скірмунт. Члены МТСГ больш за ўсё цанілі і былі ўдзячны выдатнай дзейнасці Урбана Крупскага ў 1905–1909 гг. на пасадзе аднаго з дырэктараў праўлення Мінскага таварыства ўзаемнага крэдыту (МТУК), а ў 1909–1915 гг. ужо на пасадзе старшыні МТУК. Сябры характарызавалі яго ў тыя часы як сур'ёзнага, заўсёды спакойнага, жорсткага на першы погляд, маламоўнага, адважнага, шчырага, спагадлівага і справядлівага чалавека [8]. Адносіны паміж Урбанам Крупскім і Раманам Скірмунтам былі добрыя. 21 мая 1912 г. Урбан Крупскі стаў сузаснавальнікам Мінскага таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі, якое ставіла за мэту вывучэнне прыроды, культуры і гісторыі Мінскай губерні і шырэй, а створаны таварыствам у 1912 г. мінскі гарадскі музей стаў асновай сучаснага Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі. 20 кастрычніка 1912 г. Рамана Скірмунта адзінагалосна выбралі пажыццёвым членам таго таварыства [16, с. 11].

Акрамя таго, Урбан Крупскі вельмі любіў паляванне, для чаго з вялікай кампаніяй ездзіў у прыватныя лясы сваіх сяброў – графаў Чапскіх і нясвіжскіх князёў Радзівілаў. Паводле Марыі Чапскай, блізкімі сябрамі дому графаў Чапскіх у Прылуках былі маянткоўцы-суседзі – Міхал Ленскі з маёнтка Хотава, Ядвіга Любанская (з роду Кеневічаў) з Лошыцы, Зянон Ленскі з жонкай Анетай, Пётр Ванькові з жонкай Габрыэлай (з роду Горватаў) са Сляпянкі, а ў Станькаве (бо было больш лясоў для палявання) – маянткоўцы Альгерд Свіда, Урбан Крупскі, Зянон Ленскі, а з Варшавы – пан Пульяноўскі і пралат Зыгмунт Хелміцкі (заўзяты паляўнічы) [17, с. 144–145].

У пачатку XX ст. МТСГ становіцца галоўным цэнтрам распрацоўкі ліберальна-кансерватыўнага кірунку так званай «краёвай ідэі» («краёвай канцэпцыі»), якая сумяшчала ў сваёй праграме аўтанамісцкія («краёвыя»), ліберальныя і інтэрнацыянальныя лозунгі (у тым ліку заяўленне пра беларусаў як пра асобны славянскі народ), а яе цэнтральнай ідэяй было ўвядзенне ў Расійскай Імперыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнай аўтаноміі кіравання сваім беларуска-літоўскім «Краем» (з мясцовым парламентам у Вільні). Нашчадкі разгромленых паўстанцаў 1863–1864 гг., калі ішла гаворка пра поўную дзяржаўную незалежнасць «Края» ад Расійскай Імперыі, разумелі, што цяпер аўтаномія ў складзе Расіі – гэта максімум, чаго можна патраба-

ваць ад цара. Урбан Крупскі належаў да краёўцаў-кансерватараў і з даверам ад выбаршчыкаў актыўна ўдзельнічаў з 1906 г. у выбарчым камітэце Мінскага павета да выбараў у Дзяржаўную Думу, Дзяржаўны Савет Расійскай Імперыі і мінскае земства [8; 18], хоць католікам з 1907 г. заўсёды ставіліся вялікія перашкоды з боку ўлад.

Урбан Крупскі памёр ад працяглай хваробы 17(30) мая 1915 г. у Мінску і быў пахаваны сваякамі ў маёнтку Засулле 22 мая (4 чэрвеня) 1915 г. у прысутнасці сяброў і калег, а галоўным прамоўцам над труной быў князь Геранім Друцкі-Любецкі [19; 20]. Сын Урбана Чэслаў Крупскі стаў паплечнікам Эдварду Вайніловічу [21, с. 247, 249], рэдактарам газеты «Dziennik Miński», членам Рады БНР, членам Камітэта абароны Крэсаў (1918), выканаўцам абавязкаў навагрудскага ваяводы (1921) і соймавым паслом (1938–1939) Польшчы.

Такім чынам, дзейнасць і сетка кантактаў Урбана Крупскага сведчаць не проста аб «эстафетнай» пераемнасці, а непасрэдным уплыве многіх ідэй «гоманаўцаў» (у першую чаргу, аб асобнасці і самабытнасці беларускага народа, палітычнай суб’ектнасці Беларусі ў форме аўтаноміі ў складзе Расіі, абуджэнні беларускай самасвядомасці і прагрэсіўнага развіцця грамадства) на погляды ліберальна-кансерватыўнага каталіцкага маянтковага дваранства Беларусі (галоўным чынам, членаў МТСГ), якія распрацавалі кансерватыўны варыянт «краёвай канцэпцыі» ў пачатку XX ст. і не саромеліся адкрыта называць сябе беларусамі.

Аб значэнні прадмовы да «Дудкі беларускай» (1891) Францішка Багушэвіча, якая лічыцца своеасаблівым маніфестам беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння ў канцы XIX ст., М. Доўнар-Запольскі напісаў: «Багушэвіч у наступстве быў вельмі папулярны ў беларускім асяроддзі, але цяпер цяжка сказаць, у якой меры яго кніжка, выдадзеная ў Кракаве, была вядома ў самой Беларусі, але выказаныя ім ідэі спавядаліся тады многімі» [1, с. 450]. На нашу думку, тое самае можна сказаць і пра беларускія палітычныя рухі канца XIX – пачатку XX ст.: ідэю палітычнай суб’ектнасці Беларусі і асобнасці беларускага этнасу выказвалі не толькі беларускія сацыялістычныя групы, але і, у першую чаргу, беларускія ліберал-кансерватары з ліку маянтковых дваран.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Довнар-Запольский, М. В.* История Белоруссии / М. В. Довнар-Запольский. – Минск: Беларусь, 2003. – 678 с.

2. Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1772–1917 гг. / А. У. Унучак [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2018. – 573 с.

3. *Латышонак, А.* Гісторыя Беларусі ад сярэдзіны XVIII ст. да пачатку XXI ст. / А. Латышонак, Я. Мірановіч. – 2-е выд. – Смаленск: Інбелкульт, 2013. – 368 с.

4. *Александровіч, С.* Яны выдавалі «Гоман» / С. Александровіч // Літаратура і мастацтва. – 1970. – № 46. – С. 10–11.

5. Метрыка нацыянальнай ідэі. Круглы стол да 130-годдзя выдання часопіса «Гомон» // Беларуская думка. – 2014. – № 12. – С. 38–45.

6. Wroń [Narkiewicz-Jodko, W.] Z powodu odezwy białoruskiej / Wroń // Przedświt. – 1903. – № 2. – S. 53–57.
7. *Радзік, Р.* Вытокі сучаснай беларускасці. Беларусы на фоне нацыятворчых працэсаў у Цэнтральна-Усходняй Еўропе XIX ст. / Р. Радзік; пер. з польск. мовы Н. Дзенісюк; навук. рэд. С. Рудовіч; С. Токць. – Мінск: Медысонт, 2012. – 376 с.
8. Ś.p. Urban Krupski // Kurjer Litewski. – 1915. – № 136. – S. 1.
9. *Jurkowski, R.* Ziemiaństwo polskie Kresów Północno-Wschodnich 1864–1904. Działalność społeczno-gospodarcza / R. Jurkowski. – Warszawa: Przegląd Wschodni, 2001. – 606 s.
10. Отчет Юбилейной сельско-хозяйственной и кустарно-промышленной выставки, устроенной в г. Минске в 1901 году Минским обществом сельского хозяйства. – Минск: И. и В. Тасьман, 1902. – 179 с.
11. Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности. XXI. Минская губерния. – СПб.: Исидор Гольдберг, 1903. – 444 с.
12. *Romer, E.* Dziennik: w 2 t. / E. Romer. – Warszawa: Interlibro, 1995. – T. 1. 1914–1918. – 639 s.
13. W Dźwińsku. Zjazd okręgowy. Uroczyste otwarcie zjazdu, 1 września // Kraj. – 1903. – № 36. – S. 18.
14. Mińsk // Kurjer Litewski. – 1907. – № 103. – S. 3.
15. Echa Mińskie // Kurjer Litewski. – 1907. – № 233. – S. 3.
16. Известия Минского общества любителей естествознания, этнографии и археологии. – Минск: Д. Форин, 1914. – Вып. 1. – 58 с.
17. *Czapska, M.* Europa w rodzinie. Czas odmieniony / M. Czapska. – Kraków: Znak, 2014. – 384 s.
18. Ś.p. Urban Krupski // Świat. – 1915. – № 26. – S. 12.
19. Ś.p. Urban Krupski // Kurjer Litewski. – 1915. – № 130. – S. 1.
20. Pogrzeb ś. p. Krupskiego // Kurjer Litewski. – 1915. – № 135. – S. 2.
21. *Woyniłłowicz, E.* Wspomnienia. 1847–1928 / E. Woyniłłowicz. – Wilno: Józef Zawadzki, 1931. – cz. 1. – 368 s.

**(Дата падачы: 27.02.2023 г.)**